медыйныя сцэны. Пачынаецца з антыпралога, дзе селянін па-свойму разумее многія польск. словы, звязаныя з тэатр. пастаноўкай. Камічны эфект дасягаецца супастаўленнем «высокага» і «нізкага» стыляў (напр., стралецкія спаборніцтвы параўноўваюцца з забойствам свінні, гарматныя стрэлы нагадваюць трэск дроў у печы). Калі ў антыпралогу гарбар павучае недасведчанага селяніна, дык у пралогу аказваецца, што ён сам недасведчаны ў польск. мове. Антыпралог і пралог узаемазвязаны, выконвалі маральна-дыдактычную функцыю і сведчылі аб тым, што езуіты імкнуліся прывабіць на прадстаўленні праваслаўнае і ўніяцкае насельніцтва.

Дзеянне ў драме адбываецца як бы ў 3 вымярэннях. Метафіз. свет нябачны простаму воку. Прысуды чалавеку, супраць якіх ён бяссільны, выносяцца ў небе. Другая рэчаіснасць — феадальныя ўсобіцы ў Стараж. Русі, жорсткасць нораваў, першыя крокі хрысціянства. Трэцяя — рэальны свет, забіты цёмнымі, знясіленымі цяжкай працай сялянамі. У інтэрмедыях адлюстравана жыццё бел. грамадства канца 17 ст. Героі п'есы (селянін, гарбар, яўрэй, салдат, казак, парабкі) гавораць па-беларуску, але па сваёй сутнасці гэта людзі грубыя і абмежаваныя. Аўтар (верагодна, езуіт) прадстаўляе ідэалогію пануючых класаў. Твор апублікаваны Ю.Ляванскім у зб. «Старапольская драматургія» (Варшава, 1963, т. 6).

*Літ.*: Мальдзіс А.І. На скрыжаванні славянскіх традыцый. Мінск, 1980.

*У.І.Каяла.*

**ДУХОЎНАСЦЬ**, вышэйшая здольнасць чалавека, крыніца самавызначэння асобы. У свецкім разуменні — гэта сац. феномен, які акумулюе ў сабе жыццесцвярджальныя, гуманныя ідэі, установкі, мэты, патрэбнасці, маральныя, культурныя і рэлігійныя каштоўнасці індывіда, сац. груп, чалавецтва ў цэлым; у рэліг. трактоўцы — нецялесны, нематэрыяльны феномен, які адносіцца да Бога, царквы, веры. Тэрміны «дух», «духоўнасць» атрымалі разнастайныя інтэрпрэтацыі ў розных культурах. Уяўленне аб духах з'яўляецца адным з самых ранніх у культуры, сустракаецца ўжо ў архаічных формах рэлігіі (фетышызм, татэмізм, анімізм). Духі ўяўляюцца істотамі, што звязаны з чалавекам, яго прыродным і сац. асяроддзем і ўвасабляюць як стваральныя, так і разбуральныя сілы, падзяляюцца на добрых і злых. Уяўленне аб духоўным быцці афармляецца ў вучэннях монатэістычных рэлігій. Бог уяўляецца як пазамежнае быццё, якое стварае свет «з нічога». Асабліва развіццё паняцце Д. атрымала ў хрысціянскай культуры. Хрысціянскія ўяўленні аб духоўным быцці маюць канфесіянальныя асаблівасці. У сучаснай філас. інтэрпрэтацыі паняцце «дух» звязваецца не толькі з рацыянальна-пазнавальнымі, але і пачуццёва-псіхал., маст.-эстэтычнымі, маральнымі і інш. здольнасцямі чалавека. У адрозненне ад інтэлекту праявы Д. суадносяцца з канкрэтнай асобай. У паняцці Д. акцэнтуецца значнасць каштоўнаснага зместу, яго адносная незалежнасць ад эмацыянальных перажыванняў. У адрозненне ад ментальнасці Д. абапіраецца на ўсвядомленыя праявы асобы. Душа ж з'яўляецца ўніверсальным паняццем, якое абазначае жыццёвую сутнасць чалавека (у інш. культурах таксама жывёл і раслін), што адрозніваецца ад цела і духа, з'яўляецца вымярэннем унутранага свету чалавека. Д. нараджаецца там, дзе асоба пачынае па-філас. асэнсоўваць жыццё і сваё месца ў свеце. Такая рэфлексія становіцца асновай для ўяўлення аб ідэі, ідэйным, духоўным змесце жыцця. Працэс духоўнай творчасці ў гісторыі культуры ўключае рэлігію, філасофію і мастацтва. Да якаснага зместу Д. можна аднесці чалавечнасць, любоў, сумленне, творчасць. Вышэйшай формай духоўных адносін да свету з'яўляецца любоў. Вышэйшым відам творчасці выступаюць самапазнанне, саматварэнне чалавекам самога сябе.

Вытокі Д. ў Беларусі можна аднесці да дахрысціянскай эпохі — яны выцякаюць і звязаны з агульнымі тэндэнцыямі станаўлення чалавека як сац. істоты. Д. праяўлялася ў форме ўзаемападтрымкі, спачування, шанавання супляменнікаў і да т.п., што зафіксавана ў нар. бел. казках, легендах, паданнях, міфах, песнях, прыказках і прымаўках. Рэліг. Д. — вынік хрысціянізацыі Беларусі; форма яе быцця — рэліг. свядомасць, якая паступова выцясняла язычніцкую з яе раннімі формамі Д., зберагаючы пры гэтым і ўбіраючы ў сябе ў перапрацаваным выглядзе асобныя элементы свецкай Д. розных этнічных супольнасцей на тэр. Беларусі. У 11—12 ст. адбываўся своеасаблівы сінтэз свецкай і рэліг. Д. пры несумненным дамінаванні апошняй. Гэта знайшло адлюстраванне ў філас. і грамадска-паліт. думцы Беларусі, у прыватнасці ў рэліг.-філас. светапоглядах *Ефрасінні Полацкай*, *Клімента Смаляціча* і інш. У эпоху Адраджэння асн. складальнай Д. становіцца чалавекалюбства. Ф.Скарына лічыў яго вышэйшым прынцыпам узаемаадносін паміж людзьмі, хоць па-ранейшаму звязваў Д. з распаўсюджваннем ідэй Свяшчэннага Пісання. На мяжы 18—19 ст. многія бел. мысліцелі пад уплывам зах.-еўрап. філасофіі Новага часу звязвалі Д. з распаўсюджаннем асветніцтва і развіццём навукі, г.зн. рабілі стаўку на фарміраванне свецкай Д. У канцы 19 — пач. 20 ст. творчая інтэлігенцыя (М.*Багдановіч*, *Я.Купала* і інш.) разглядалі Д. як ідэю сац. справядлівасці, развітую самасвядомасць беларусаў. У 1920—50-я гг. Д. як сац. феномен практычна не даследавалася. У межах марксісцкай філас. традыцыі аналізаваліся грамадская свядомасць і яе розныя формы, дыялектыка-матэрыялістычны светапогляд і шляхі яго фарміравання, духоўная культура. Навук. зацікаўленасць праблемай Д. адрадзілася ў 1960—70-я гг. ў сувязі з пастаўленай на дзярж. узроўні задачай фарміравання новага, інтэ-

РЭПАЗІТОРЫЙ БГПУ

лектуальна і духоўна развітога чалавека. Але Д. зводзілася да духоўнай жыццядзейнасці людзей, у выніку якой ствараліся адпаведныя навук. ідэі, каштоўнасці, прыклады паводзін. З 1990-х гг. даследуюцца пытанні, звязаныя з высвятленнем прычын і пошукамі шляхоў пераадолення характэрнай для пераходнай эпохі бездухоўнасці, высвятляюцца патэнцыі рэліг. Д. Асаблівая ўвага надаецца аналізу духоўна-маральных каштоўнасцей хрысціянства і іх ролі ў фарміраванні духоўнага патэнцыялу бел. нацыі. Вядуцца распрацоўкі ў галіне самаідэнтыфікацыі, самасвядомасці, духоўных асноў бел. грамадства.

*Літ.*: Адуло Т.И. Человек на рубеже тысячелетий: поиск духовных оснований бытия. Минск, 2003; Яго ж. В поисках сущности бытия: философия на рубеже XX–XXI веков. Минск, 2011; Конан У.М. Ля вытокаў самапазнання: Станаўленне духоўных каштоўнасцей у святле фальклору. Мінск, 1989; Яго ж. Гісторыя эстэтычнай думкі Беларусі. X ст. — 1905 г. Т. 1. Мінск, 2010; Филарет (Вахромеев К.В.; митрополит Минский и Слуцкий). Человек в истории. Минск, 2008.

*Т.І.Адула, В.Р.Языковіч.*

**ДУХО́ЎНАЯ КУЛЬТУ́РА**, спецыфічны духоўны прадукт чалавечай жыццядзейнасці, сац. арганізацыі і пазнання, вызначальны фактар духоўнага жыцця грамадства, які прадстаўлены ідэямі, устаноўкамі, каштоўнасцямі, традыцыямі, спосабамі паводзін, сістэмай сац. норм і служыць сродкам забеспячэння нармальнага функцыянавання грамадства, развіцця і ўзнаўлення сац. жыцця. Д.к. выступае як адна з дзвюх (побач з матэрыяльнай), у інш. класіфікацыях — як адна з трох (побач з матэрыяльнай і сац.) форм культуры. Д.к. з'яўляецца вынікам духоўнай дзейнасці чалавецтва. Паколькі падзел дзейнасці на матэрыяльную і духоўную ўмоўны, то і раздзяленне культуры на матэрыяльную і духоўную таксама ўмоўнае. Кожны створаны чалавекам матэрыяльны аб'ект змяшчае ў сабе элементы Д.к. ў выглядзе ўвасобленых у ім мэты, ідэі, праграмы дзеянняў і інш. Многія прадукты духоўнай дзейнасці чалавека таксамы немагчымыя без адпаведнай матэрыяльнай абалонкі (карціна, муз. твор і інш.). Асн. сферы існавання Д.к. — міфалогія, рэлігія, мараль, праваcвядомасць, мастацтва, навука, філасофія, мова і інш. Многія даследчыкі ў якасці важнейшай формы Д.к., яе ядра вылучаюць філас. культуру, паколькі менавіта на ёй замыкаюцца ўсе астатнія. Д.к. — прадукт гіст. развіцця грамадства, яна фіксуе асаблівасці гістарычна канкрэтных форм жыццядзейнасці чалавецтва на розных этапах яго развіцця, арганічна звязана з матэрыяльнай і сац. культурамі. У розных народаў мае адметныя рысы, што дае падставу для развіцця тэорыі культ. рэлятывізму, згодна з якой кожная культура з'яўляецца ўнікальнай, адзінай у сваім родзе, непадобнай на інш. Этнацэнтрызм, у процівагу культ. рэлятывізму, акцэнтуе ўвагу на агульным, універсальным у розных культурах. Найбольш абгрунтаванай уяўляецца тэорыя, згодна з якой нац. Д.к. ўяўляе сабой дыялектычны сінтэз унікальнага і ўсеагульнага. Гэта вынік агульных законаў, паводле якіх развіваецца грамадства, узаемасувязі і ўзаемаўплывы сфер грамадскага жыцця розных этнасаў, нацый, дзяржаў. Самаізаляцыя нац. культур вядзе да іх заняпаду. Аднак сучасная глабалізацыя павялічыла пагрозу паглынання Д.к. невял. нацый. Таму малыя нацыі праводзяць палітыку стрымлівання ўплыву глабальных працэсаў, прымаюць меры для прадухілення негатыўнага ўплыву глабалізацыі і захавання нац. Д.к.

*Літ.*: Коган Л.Н. Социология культуры. Екатеринбург, 1992; Конан У.М. Гісторыя эстэтычнай думкі Беларусі. X ст. — 1905 г. Т. 1. Мінск, 2010. *Т.І.Адула.*

**ДУХО́ЎНАЯ ЛІТАРАТУ́РА**, рэлігійныя проза і паэзія, якія ўключалі ў сябе жанры стараж. царк. і нар. паданняў рэліг. зместу. Адлюстроўвала грамадскае разуменне дабра і зла, граху і збавення, справядлівасці, паходжання свету, гіст. падзей. З Д.л. усх. славяне пазнаёміліся выключна праз пераклады з балгарскіх і візант. узораў на старaслав. мову. Вызначальную ролю ў духоўным жыцці сярэдневяковага чалавека адыграла *Біблія* – асн. кніга, якая стаяла ля вытокаў культур усіх хрысціянскіх народаў. Блізкімі да яе па змесце, эмацыянальным ладзе і фармальных прыкметах былі *апокрыфы* – рэліг. аповесці, не ўключаныя ў богаслужэбны ўжытак з-за таго, што іх змест не поўнасцю супадаў з патрабаваннямі афіц. веравучэння («Блуканне Багародзіцы па пакутах», «Пакуты Хрыста», евангеллі ад Нікадзіма, Пятра, Філіпа, Фамы, Марыі, Іакава).

Прынцыпова інш. характар па змесце і форме мела *патрыстычная літаратура* – творы айцоў царквы (3–8 ст.). Найб. папулярнымі былі творы В.Вялікага, Г.Назіянзіна, Я.Сірына, А.Александрыйскага, І.Дамаскіна, І.Златавуста. У сярэдневяковай л-ры былі шырока прадстаўлены жыціі святых, складзеныя па ўсталяваных канонах агіяграфічнага жанру пра хрысціянскіх падзвіжнікаў, дзеячаў і герояў. Гэтыя жыццяпісы вызначалі вернікам шлях да выратавання душы, таму жыційны канон быў не вонкавым патрабаваннем, а ўнутранай пазіцыяй аўтара.

Пад уплывам візант. «Жыція Антонія Вялікага» (4 ст.) не пазней 1090-х гг. было напісана «Жыціе Антонія Пячэрскага», якое адпавядала ўсім кананічным патрабаванням свайго часу. Паводле яго ўзору ўзнік 1-ы бел. агіяграфічны твор *«Жыціе Ефрасінні Полацкай»* (12 ст.). Да гэтага бел. чытач быў знаёмы толькі з перакладзеным з грэч. мовы *«Жыціем Аляксея, чалавека Божага»* (11 ст.). У 12 ст. з'явіліся арыгінальныя жыціі Аўрамія Смаленскага і Кірылы Тураўскага, у 14 ст. – знакамітае «Жыціе трох віленскіх мучанікаў», а ў 1579 у Вільні выйшаў вялікі зб. *«Жыціі святых»*, складзены езуіцкім епіскапам

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ